# Хроніка беларускай культуры.

## Беларуская Дзярж. Бібліатэка.

З Масквы і Ленінграду вярнуўся 11 кастрычніка загадчык Бел. Дзярж. Бібліатэкі т. Шыманоўскі. Згодна пастанове прэзыдыуму ЦВК, яму ў абедзьвюх сталіцах удалося падпісаць умовы на папаўненьне нашай бібліатэкі. Такія ўмовы ў Маскве падпісаны з бібліатэкаю Гістарычнага Музэю, якая накапіла кніжныя фонды гуманітарных навук, і з бібліатэкаю Палітэхнічнага Музэю, якая гуртавала выданьні па прыродазнаўству і ўсіх галінах практычных ведаў. Фонды абедзьвюх бібліатэк—да 1 міліёну томаў. Нам дадзена ва ўмове права першага выключнага адбору з дублетных гэтых фондаў абедзьвюх бібліатэк, з расцэнкаю кніжак і тэрмінамі ўплаты па ўзаемнаму ўгавору.

Адкрыта яшчэ адна крыніца папаўненьня танным спосабам нашай бібліатэкі — гэта праз кніжныя склады Маск. Савету, якія таксама забясцэн распрадаюць свае запасы. Досыць зазначыць, што да 400 тамоў нямецкіх навуковых выданьняў т. Шыманоўскім куплена за 120 рублёў.

У Ленінградзе падпісана ўмова з „Кніжным фондам“ Нар. Кам. Асьветы, запасы якога перавышаюць 2 міліёны томаў і які нам даў права выключнага адбору са ўсякімі іншымі льготамі. Згодна пастанове аддзелу навук. бібліат. Наркамасьветы, нам тут выдалі 3000 томаў бясплатна для папаўненьня бібліатэкі. Кнігі гэтыя былі т. Шыманоўскім атабраны, але частка іх у часе ленінградзкага навадненьня замокла і праз гэта загі[н]ула. Але нам далі права замест[а] папсаваных паводзьдзем кніг атабраць сабе такі-ж лік другіх кніжак.

Умова падпісана яшчэ з „Кніжным дваром“ Маскоўскага Дзярж. Выдавецтва, запасы якога—каля 6 міліёнаў томаў. Нам дадзена права першага выключнага адбору кніжак у ліку 50.000 томаў, на працягу паўтара году са скідкаю 50 прац. з антыкварных паніжаных цэн, гэта знача з факт. скідкаю [?] 70—80 прац. з наміналызае цэны

Такім чынам, Бел. Дзярж. Бібліатэка мае зараз добрыя пэрспэктывы свайго папаўненьня.

## Камісія дасьледаваньня прыродных багацьцяў БССР пры Дзяржпляне.

11 кастрычніка Саўнарком на сваім пасяджэньні, заслухаўшы справаздачу старшыні камісіі дасьледаваньня прыродных багацьцяў краю т. Дылы аб чарговых у 1924-25 гаспад. годзе дасьледаваньнях магнітных, геолёгічных, зоолёгічных і батанічных багацьцяў, назначаных камісіяй, асыгнаваў на гэтыя досьледы камісіі Дзяржпляну 10.000 р., якія і ўнёс у каштарысы наступіўшага новага гаспадарчага году.

Геолёгічныя досьледы гэтага году канчаткова разьвязалі праблему адшуканьня чыстых кварцавых пяскоў каля Урэчча—пяскі гэтыя, урэшце, знайдзены і зараз вядзецца іх хімічны аналіз. Знайдзена таксама на тэрыторыі былое Чэрвеншчыны мумія (чырвоная фарба), якая ідзе на афарбоўку зялезных дахаў. Проба дала таксама добрыя вынікі. Досьледы па Сожы і Дняпры далі багатыя наводы на тое, што мы маем там багатыя залежы гліны і іншых матар'ялаў для вырабу цэманту, зялезных руд, высокіх ганчарных глінаў, фарбаў і гэтак далей.

## Прыезд прафэсуры музтэхнікуму.

Ужо прыехалі ў Менск і прымаюць удзел у спрабаваньні кандыдатаў, жадаючых паступіць у музтэхнікум, запрошаныя прафэсарамі: выдатны знаўца бела. нар. песьні Я. Прохараў, малады, але здольны кампазытар, гарманізатар нашай песьні—Аладаў, выдатны пявец, барытон Ленінградскае дзярж. оперы В. Селек, здольны піяніста Жыў і іншыя.

У пачатку вучэбна[га] году, пасьля [яго] распачатку (каля 20-га кастрычніка) гэтап